УДК 373.3.016:811.161.3’35

**А. В. Солахаў**
**М. А. Яраховіч**

# ШЛЯХІ ВЫВУЧЭННЯ ПУНКТУАЦЫІ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

*У артыкуле паказваюцца метады і прыёмы навучання пунктуацыі малодшых школьнікаў. Паводле вучэбнай праграмы, прапануюцца шляхі знаёмства з кропкай, пытальнікам, клічнікам, коскай; на прапедэўтычным узроўні – з працяжнікам, двукроп’ем, кропкай з коскай. Вялікую дапамогу ў гэтым настаўніку акажуць спецыяльна падабраныя малюнкі і схемы.*

***Ключавыя словы:*** *прынцыпы пунктуацыі; знаёмства з кропкай; знаёмства з пытальнікам; знаёмства з клічнікам; прапедэўтычны узровень.*

## Уводзіны

Лінгвістычную аснову пунктуацыі складаюць тры важнейшыя прынцыпы – граматычны, сэнсавы і інтанацыйны, якія не супрацьпастаўляюцца, а ўказваюць на розныя бакі адной і той жа граматычнай з’явы, бо “толькі ў сваёй сукупнасці яны з’яўляюцца той асновай, на якой грунтуецца сучасная пунктуацыя” [1, с. 8].

У школьнай практыцы пунктуацыя разглядаецца вузка, толькі ў плане правапісу, і вывучаецца адначасова з сінтаксісам. Праграмай для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання вызначана знаёмства малодшых школьнікаў са знакамі прыпынку ў канцы сказа (кропка, пытальнік, клічнік) і пры аднародных членах сказа [2]. Гэтыя пытанні разглядаюцца на спецыяльна вызначаных уроках і паралельна з вывучэннем іншых тэм. Аднак разгляд іншых правілаў пастаноўкі знакаў прыпынку у пачатковых класах не прадугледжаны.

Задача настаўніка пачатковых класаў – даступнымі метадамі навучыць малодшых школьнікаў правілам пунктуацыі, развіваючы творчыя ўменні, пашыраць веды па пунктуацыі за кошт прапедэўтычнай працы. Добра засвоеныя пунктуацыйныя веды дапамагаюць лепш разумець сэнс прачытаных тэкстаў, граматна будаваць свае выказванні, па-сапраўднаму спасцігаць таямніцы роднай мовы.

## Асноўная частка

Пры знаёмстве са знакамі прыпынку ў канцы сказа выкарыстоўваецца метад назірання, гутаркі і аналізу. Так, пры знаёмстве з кропкай настаўнік чытае некалькі сказаў, запісаных на дошцы без знакаў прыпынку ў канцы:

*Зямнымі сонцамі здаваліся ў гэты час бярозы і клёны*
*Неба было бязвоблачнае, як летам*
*Была сонечная асенняя раніца*

МГПУ им. И.П.Шамякина

Затым ён праводзіць гутарку па наступных пытаннях:

– Які знак прыпынку патрэбна паставіць у канцы гэтых сказаў на пісьме? (Кропку.)



**Малюнак 1**

– Звярніце, калі ласка, увагу на малюнак кропкі (малюнак 1). (Настаўнік паказвае малюнак.) Якія пачуцці выражае кропка? (Нейтральныя, спакойныя…)

– З якой інтанацыяй мы чыталі гэтыя сказы? (З інтанацыяй паведамлення.)

– Адгарніце падручнік і знайдзіце адказ на пытанне: як называюцца сказы, у якіх што-небудзь паведамляецца? (Апавядальнымі.)

Пры знаёмстве з клічнікам настаўнік прапануе дзецям спачатку ўважліва разгледзець сказы, запісаныя на дошцы без знакаў прыпынку ў канцы, і прачытаць іх з патрэбнай інтанацыяй:

*Вось дык сустрэча*
*Ура-а Го-ол*
*Якая цудоўная сёння раніца*
*Не ламайце галінак дрэў і кустоў*

Чытанне сказаў вучнямі абмяркоўваецца.

– Хто, на вашу думку, прачытаў свой сказ больш правільна? Чаму вы так лічыце?

Калі вучні чыталі сказы без клічнай інтанацыі, настаўнік паказвае ўзор чытання.

– З якой інтанацыяй неабходна чытаць гэтыя сказы? (З клічнай.)

– Чаму? (У сказах перадаюцца пачуцці радасці, захаплення, заклік.)



**Малюнак 2**

– Які знак прыпынку неабходна паставіць у канцы кожнага сказа на пісьме? (Клічнік.)

– Паглядзіце, калі ласка, вось на гэты малюнак (малюнак 2). (Настаўнік паказвае малюнак.) Якія пачуцці выражае гэты знак? (Пачуцці радасці, захаплення.)

– Адгадайце, як называюцца сказы, якія вымаўляюцца з клічнай інтанацыяй? (Клічныя.)

Вучням можна прапанаваць разгледзець розныя малюнкі клічніка (малюнкі 2–4) для таго, каб яны сказалі, якія пачуцці выражае кожны з іх (здзіўленне, радасць, захапленне).



**Малюнак 3**



**Малюнак 4**

МГПУ им. И.П.Шамякина

Пры знаёмстве з пытальнікам настаўнік таксама прапануе дзецям спачатку ўважліва разгледзець сказы, запісаныя на дошцы без знакаў прыпынку ў канцы, і прачытаць іх з патрэбнай інтанацыяй:

*Як трэба паводзіць сябе на ўроку*

*Можа, трэба паліць кветкі*

*Які сёння дзень*

Прачытаныя вучнямі сказы абмяркоўваюцца.

– Хто, на вашу думку, прачытаў свой сказ больш правільна? Чаму вы так лічыце?

– Што выражае кожны з прачытаных сказаў? (Пытанне.)

– З якой інтанацыяй неабходна чытаць гэтыя сказы? (З пытальнай.)

– Паглядзіце, калі ласка, вось на гэты малюнак (малюнак 5). (Настаўнік паказвае малюнак.) Што выражае гэты знак? (Ён выражае пытанне.)

– Як называюцца сказы, якія вымаўляюцца з пытальнай інтанацыяй? (Пытальныя).

Малюнкі знакаў прыпынку можна выкарыстоўваць на ўроках замацавання, абагульнення і паўтарэння вывучанага матэрыялу. Яны могуць ужывацца як сігнальныя карткі.



**Малюнак 5**

1. Настаўнік паказвае картку з кропкай, пытальнікам або клічнікам, а вучні павінны з правільнай інтанацыяй прачытаць запісаны на дошцы сказ. Напрыклад:

*На вуліцы ідзе дождж*

*Ты выпіў усю ваду*

*Дзеці, паспяваем*

2. Настаўнік паказвае картку са знакам прыпынку (кропкай, пытальнікам або клічнікам), а вучні прыдумваюць сказ з адпаведнай інтанацыяй у канцы.

3. Настаўнік паказвае картку са знакам прыпынку, а вучні, загадзя атрымаўшы папяровыя стужачкі са сказамі (без знакаў прыпынку ў канцы сказа), па чарзе выходзяць да дошкі, чытаюць сказ з патрэбнай інтанацыяй і прымацоўваюць стужку са сказам пад малюнкам адпаведнага знака прыпынку.

4. Кожны вучань мае свой набор ілюстраваных картак-знакаў. Настаўнік чытае сказ, вучні падымаюць тую картку, якая адпавядае знаку прыпынку ў канцы прачытанага сказа.

5. Клас дзеліцца на тры групы. Кожная група вучняў падымае малюнак толькі аднаго якога-небудзь знака прыпынку (напрыклад, у класе 15 вучняў: 5 вучняў падымае клічнік, 5 – пытальнік, 5 – кропку). Настаўнік чытае сказ, вучні падымаюць картку, калі лічаць, што іх знак патрэбна паставіць у канцы сказа.

МГПУ им. И.П.Шамякина

У пачатковых класах вучні набываюць уменні пералічваць прадметы, прыметы і дзеянні. Таксама яны называюць і спалучаюць словы, якія маюць агульнае лексічнае значэнне, аднолькавыя прыметы паняццяў. Ужо ў першым класе школьнікі вучацца падбіраць да слоў, што абазначаюць родавыя паняцці, словы, якія абазначаюць відавыя, і наадварот, практычна знаёмяцца са знакамі прыпынку пры чытанні сказа (кропка, клічнік, пытальнік, коска), чытаюць сказы з паўзамі і інтанацыяй, адпаведным знакам прыпынку. У другім класе – павінны ўмець правільна афармляць сказ на пісьме, бачыць сувязь слоў у сказе. У трэцім класе вучні знаёмяцца з паняццем пра дадаткныя члены сказа. У чацвёртым – яны вывучаюць аднародныя члены сказа; сказы з аднароднымі дзейнікамі, выказнікамі; сродкі сувязі аднародных членаў сказа; злучнікі *і, а, але*; знакі прыпынку паміж аднароднымі членамі сказа [2].

Са знакамі прыпынку пры аднародных членах сказа настаўнік выкарыстоўвае ілюстраваныя сказы-схемы, змешчаныя на дошцы (тут і далей выкарыстаны малюнкі і фотаздымкі з электроннай сеткі Інтэрнэт):

 **?**  **?**  водзяцца ў нашых лясах.

Пачынаючы працу з гэтым сказам, настаўнік звяртаецца да вучняў:

– Паглядзіце ўважліва на дошку і скажыце, што вы там бачыце? (На дошцы тры малюнкі, на якіх змешчаны лясныя жывёлы, два пытальнікі, чатыры словы і кропка.)

– Перад вамі сказ, напалову зашыфраваны малюнкамі і пытальнікамі. Яго трэба расшыфраваць. Але давайце не спяшацца. Спачатку праверым, ці ведаеце вы жывёл. Якія жывёлы адлюстраваны на 1-м малюнку? На 2-м? На 3-м? (На 1-м – зубры; на 2-м – ласі; на 3-м – дзікі.)

– Якое пытанне паставім да слоў *зубры, ласі, дзікі*? (*Хто*?)

– Ці можна сцвярджаць, што словы *зубры, ласі, дзікі* адказваюць на адно і тое ж пытанне? (Можам.)

– Уважліва паглядзіце на дошку і скажыце, якімі знакамі прыпынку аддзяляюцца на пісьме словы *зубры, ласі, дзікі*. (Коскамі.)

– З якой інтанацыяй яны вымаўляюцца? (З інтанацыяй пералічэння.)

– Як, на вашу думку, будуць называцца словы *зубры, ласі, дзікі*? Калі не ведаеце, адгарніце падручнікі і падгледзьце іх назву.

– Дык як называюцца словы *зубры, ласі, дзікі*? (Аднародныя члены сказа.)

– Што значыць слова *аднародныя*? (Аднародныя – значыць аднаго роду, аб’яднаныя адным якім-небудзь паняццем: *зубры, ласі, дзікі* – гэта лясныя жывёлы.)

МГПУ им. И.П. Шамякина

– Прачытаем увесь сказ. З якой інтанацыяй будзем чытаць аднародныя члены сказа? (З інтанацыяй пералічэння. *Зубры, ласі, дзікі водзяцца ў нашых лясах.*)

– Запішыце сказ у сшытку.

– Якімі членамі сказа з'яўляюцца аднародныя словы *зубры, ласі, дзікі*? (Дзейнікамі.)

Разам з тым, у тэкстах, якія прапануюцца дзецям, сустракаюцца і іншыя знакі прыпынку, якія неабходна разглядаць з вучнямі на прапедэўтычным узроўні. Да іх адносіцца, напрыклад, ужыванне працяжніка і двукроп'я пры аднародных членах сказа і абагульняльных словах. Працу пакажам з выкарыстаннем ілюстраванай сказа-схемы:




– Што вы бачыце на дошцы? (Тры малюнкі, чатыры пытальнікі і адно акенца.)

– Хто адлюстраваны на 1-м малюнку? На 2-м? На 3-м? (На 1-м – заяц; на 2-м – вавёрка; на 3-м – ласка.)

– На якое пытанне яны адказваюць? (Хто?)

– Як называюцца гэтыя словы? (Аднародныя члены сказа.)

– З якой інтанацыяй яны вымаўляюцца? (З інтанацыяй пералічэння.)

– Як зайца, вавёрку, ласку можна назваць адным словам? (Звяркі.)

– Ці можна гэта слова назваць абагульняльным ў адносінах да слоў *заяц, вавёрка, ласка*? (Можна.)

– Куды на нашай схеме ўпішам абагульняльнае слова звяркі? (Замест пытальніка ў акенца.)

– У якім становішчы стаяць аднародныя члены сказа ў адносінах да абагульняльнага слова? (Перад абагульняльным словам.)

– Якім знакам прыпынку аддзяляюцца аднародныя члены сказа адзін ад другога? (Коскамі.)

– Колькі косак паставім і дзе? (Дзве коскі – замест першых двух пытальнікаў.)

– Які знак прыпынку трэба паставіць замест трэцяга пытальніка – пасля пералічэння назваў звяркоў? (Працяжнік.)

– Як мы запішам пра гэта ў сшытку? (*Заяц, вавёрка, ласка – звяркі.*)

Другі прыклад.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Мы збіраем грыбы :  ?  ?  .

– Што вы бачыце на дошцы? (Адно акенца з трыма словамі і пытальнікам, тры малюнкі, яшчэ два пытальнікі і кропку.)

– Што адлюстравана на 1-м малюнку? На 2-м? На 3-м? (На 1-м – баравікі; на 2-м – лісічкі; на 3-м – падасінавікі.)

– На якое пытанне яны адказваюць? (Што?)

– Як называюцца гэтыя словы? (Аднародныя члены сказа.)

– З якой інтанацыяй яны вымаўляюцца? (З інтанацыяй пералічэння.)

– Як адным абагульняльным словам мы можам назваць гэтыя аднародныя члены сказа? (Грыбы.)

– У якой пазіцыі стаяць аднародныя члены ў адносінах да абагульняльнага слова? (Пасля абагульняльнага слова.)

– Якія знакі прыпынку патрэбна паставіць? (Пасля абагульняльнага слова – двукроп’е, паміж аднароднымі членамі – коскі.)

– Як мы запішам пра гэта ў сшытку? (*Мы збіраем грыбы: баравікі, лісічкі, падасінавікі*.)

Кропка з коскай у пачатковай школе не вывучаецца таксама, але знаёмства з гэтым знакам прыпынку можна правесці на падставе складання сказаў з групамі аднародных членаў, якія адносяцца да розных родавых паняццяў. Працу можна выканаць наступным чынам.

Настаўнік прапануе вучням разгледзець змешчаныя ніжэй малюнкі і просіць назваць прадметы, змешчаныя на іх (*лімон, апельсін, яблык, абаранкі, пячэнне, торт*).

На стале ляжалі      

– На колькі груп мы можам падзяліць назвы гэтых прадметаў? Чаму? Пералічыце іх. (На дзве. 1-я – ***садавіна***: *лімон, апельсін, яблык*; 2-я – ***хлеба-булачныя вырабы***: *абаранкі, пячэнне, торт*.)

– Прыдумайце сказ з ужываннем усіх слоў. Настаўнік запісвае прыдуманы сказ на дошцы без знакаў прыпынку. (*На стале ляжалі лімон апельсін яблык абаранкі пячэнне торт*.)

МГПУ им. И.П.Шамякина

– Чым з’яўляюцца словы *лімон, апельсін, яблык, абаранкі, пячэнне, торт* у гэтым сказе? (Аднароднымі членамі сказа.)

Настаўнік прапануе разам расставіць знакі прыпынку і паясняе іх пастаноўку. (Ставім коскі пасля слоў “лімон, апельсін, абаранкі, пячэнне”; словы “яблык і абаранкі” раздзяляем кропкай з коскай – яна раздзяляе дзве групы слоў; у канцы ставім кропку.)

Мы лічым неабходным праводзіць прапедэўтычную працу па правілах ужывання знакаў прыпынку і на ўроках літаратурнага чытання. Так, пры знаёмстве з апавяданнем А. Багамолавай “Вясна спазнялася” [3, с. 85–88] можна звярнуць увагу на сказ: “Нягледзячы на сум, які панаваў у прыродзе, жыццё ішло: дні рабіліся даўжэйшыя, сонца цяплейшае, вецер мякчэйшы”. Трэба патлумачыць вучням, што двукроп’е ў гэтым выпадку ставіцца ў складаным сказе, які складаецца з чатырох частак. Тры часткі складанага сказа (*дні рабіліся даўжэйшыя, сонца цяплейшае, вецер мякчэйшы*) паясняюць у 1-й частцы галоўныя члены сказа *жыццё ішло*, таму іх трэба чытаць так, як і аднародныя члены сказа – з інтанацыяй пералічэння.

Нярэдка ў тэкстах мастацкай літаратуры выкарыстоўваюцца звароткі, якія вылучаюцца коскай (у пачатку і канцы сказа) або коскамі (у сярэдзіне сказа). Напрыклад, пры вывучэнні апавядання У. Юрэвіча “Караблік” [4, с. 20–22] настаўнік можа звярнуць увагу на словы “сынок, дзеці”, выдзеленыя коскамі і растлумачыць пастаноўку пры іх коскі:

*– Уставай, сынок… – чуе ён раптам далёка-далёка матчын голас.*

*– Дзень добры, дзеці!*

Пры вывучэнні апавядання У. Юрэвіча “Тараскавы турботы” [4, с. 56–59] можна звярнуць увагу на такі сказ: “У Тараскі бабуля такая, што без работы не сядзіць ні хвіліны”, дзе коска раздзяляе часткі складанага сказа.

Вельмі часта ў тэкстах мастацкіх твораў ужываецца працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам, выражаных назоўнікамі: *Гэта зёлка – дзівасіл; Гэтая прыгожая красачка – васілёк* [3, с. 47]. Такія канструкцыі часта ўжываюцца і самімі вучнямі. Таму настаўніку трэба растлумачваць пастаноўку працяжніка ў такіх выпадках.

**Заключэнне**

Навучанне малодшых школьнікаў пунктуацыі – адна з важнейшых задач у працы настаўніка пачатковых класаў, паколькі разуменне вучнямі зместу твораў, граматнае стварэнне ўласных тэкстаў у многім залежаць ад разумення дзецьмі ролі знакаў прыпынку ў сказе, іх правільнага ўспрымання і выкарыстання. Авалоданне малодшымі школьнікамі нормамі пунктуацыі магчымае не толькі ад якаснага выкладання настаўнікам тэм, вызначаных вучэбнай праграмай, але і арганізацыі належнай прапедэўтычнай працы аб ролі розных знакаў прыпынку ў тым або іншым сказе, асабліва на ўроках літаратурнага чытання.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Усвядоміць асноўнае прызначэнне пунктуацыі вучань можа пры ўмове, калі ён зразумее чляненне пісьмовага маўлення з дапамогай знакаў прыпынку. Садзейнічаць гэтаму будуць метады назірання, гутаркі і аналізу, выкарыстанне ў працы з вучнямі малюнкаў знакаў прыпынку, ілюстраваных схем-сказаў і інш.

Прынцып назірання патрабуе працы над інтанацыйным афармленнем сказа: яго інтанаваннем, аналізам інтанавання сказа, успрынятага на слых, узнаўленнем, імітацыяй ва ўласным маўленні. Гэта неабходная ўмова знаёмства з пунктуацыйным правілам, яго прымяненнем, тлумачэннем і абгрунтаваннем расстаноўкі знакаў прыпынку. Сістэматычная праца ў гэтым напрамку будзе садзейнічаць пашырэнню ведаў вучняў пра розныя віды інтанацыі, фарміраванню ў іх навыкаў вуснага маўлення ў адпаведнасці з пунктуацыяй, выпрацоўцы ўменняў прымяняць веды ў маўленчай дзейнасці.

### Спіс выкарыстаных крыніц

1. Бурак, Л. І. Пунктуацыя беларускай мовы / Л. І. Бурак. – Мінск : Народная асвета, 1982. – 223 с.

2. Праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2010.

3. Варапаева, В. С. Літаратурнае чытанне: падручнік для 3-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання / В. С. Варапаева, Т. С. Куцанава. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2013. – 110 с.

4. Вольскі, А. В. Літаратурнае чытанне: падручнік для 3-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання : у 2 ч. / А. В. Вольскі, І. А. Гімпель. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2012. – Ч. 1. – 112 с.

**A. V. Solakhau, M. A. Yarakhovich**

## STUDYING THE PUNCTUATION IN PRIMARY SCHOOL

**Keywords:** principles of punctuation; introduction of a dot; introduction of a question mark; introduction of an exclamation mark; propaedeutic level.

**Summary**

The article presents different methods and techniques of teaching punctuation to junior pupils. According to the curriculum, there are different ways of introduction of a dot, a question mark, an exclamation mark and a comma. At the propaedeutic level the pupils will get to learn about a dash, a colon and a semicolon. In this regard various selected illustrations can be a big help to a teacher.

МГПУ им. И.П.Шамякина